Падтрымай "Вясну" на PATREON

За катанне на роварах – штрафы і выклік у Інспекцыю па справах непаўналетніх

24.07.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед

Дзве мінчанкі — **Алеся Жыгадла** і **Паліна Чарняўская** — атрымалі штрафы ў 20 і 25 базавых велічынь адпаведна за "ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве" (арт. 23.34 КаАП) — гэтым суд палічыў катанне на ровары 8 ліпеня. Судовыя паседжанні над імі прайшлі 24 ліпеня ў судзе Цэнтральнага раёна горада Мінска.



Як распавяла Алеся Жыгадла, 8 ліпеня яна ездзіла на ровары па горадзе разам з іншымі людзьмі:

> *"Цалкам мірна сабраліся рабяты паездзіць на роварах, каб убачыць адзін аднаго. Ні пра што не размаўляючы, ехалі адзін за адным па веладарожцы".*

16 ліпеня Алеся даведалася, што ў дачыненні да яе вядзецца адміністрацыйны працэс. Акрамя таго, у той жа дзень Алесі патэлефанавалі з Інспекцыі па справах непаўналетніх і паведамілі, што на яе непаўналетнюю дачку таксама заведзеная адміністрацыйная справа (Алеся каталася на ровары разам з дачкой). Неўзабаве справу закрылі ў сувязі з недасяганнем дачкой 16-гадовага ўзросту.



Алеся Жыгадла каля будынка суда Цэнтральнага раёна

На судовым пасяджэнні Алесі ў якасці сведак праз Skype відэасувязь выступалі міліцыянт-кіроўца АМАП **Яўген Нікіценка** і камандзір аддзялення АМАП **Юрый Сцяпанаў**. Алеся мяркуе, што адзін са сведак пры дачы паказанняў чытаў ужо напісаны на паперы тэкст.

> *"На экране гэтага было не відаць, аднак ён так прамаўляў, што было зразумела, што ён чытаў тэкст. Мабыць, ен перад сабой паставіў рапарт і чытаў яго слова ў слова".*

Сведка сцвярджаў, што Алеся была апранутая ў футболку з надпісам "Я/мы97", аднак Алеся на самай справе была ў куртцы — гэта відаць і на фотаздымках, прымацаваных да матэрыялаў справы. Акрамя гэтага, апісанне сведкам ровара Алесі таксама не супала.

За "несанкцыянаванае масавае мерапрыемства", якое, згодна з пратаколам, доўжылася 10 хвілін, Алесю аштрафавалі на 20 базавых велічынь (540 рублёў). Такое рашэнне вынес суддзя **Іван Касцян.**

Паліну Чарняўскую ў той жа дзень таксама асудзілі за катанне на ровары 8 ліпеня:

> *"Каталіся па веладарожках, праспекце, усяляк выконвалі ПДР. У нас не было ніякіх лозунгаў і маек",* — распавяла "Вясне" Паліна.



Паліна Чарняўская каля будынка суда Цэнтральнага раёна

На судовым пасяджэнні Паліны выступалі тыя ж сведкі, што і ў Алесі – Нікіценка і Сцяпанаў. Характэрна, што судовыя паседжанні ў дзяўчат пачаліся паралельна – у 9.15 у кожнай.

Адзін са сведкаў сказаў, што апазнаў Паліну па чорнай майцы і доўгіх валасах. Але дзяўчына кажа, што ў той дзень была ў клятчастай кашулі. Тым не менш суддзя **Юлія Густыр** палічыла яе вінаватай і вынесла рашэнне аб штрафе ў 25 базавых велічынь (675 рублёў). Паліна мае намер абскардзіць рашэнне суда.

Раней за 10 хвілін велапрабегу **Яўгена Міхасюка** пакаралі 10-ю суткамі арышту. Таксама за велапрабег былі затрыманы 9 ліпеня **Аляксандр Масейчук** і **Андрэй Бароўскі.**

Твитнуть









ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі



#ВолюВясне





ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

EENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY